# Для развіцця краіны

**Дыялогавыя пляцоўкі па абмеркаванні праекта змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь з удзелам прадстаўнікоў працоўных калектываў, навучэнскай і студэнцкай моладзі праходзяць ва ўстановах адукацыі Віцебскай вобласці ўсіх узроўняў.**




У ВДУ імя П.М.Машэрава галоўным экспертам сустрэчы выступіла старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Таццяна Якубовіч. Як адзначыла прафсаюзны лідар, практыка правядзення дыялогавых пляцовак пераканаўча сведчыць: моладзь таксама гатова ісці на рэферэндум.

— Відавочна, што ў пераважнай большасці яны ўжо гэты праект прапрацавалі або самі, або, магчыма, з педагогамі і юрыстамі, — падзялілася ўражаннямі Таццяна Якубовіч. — Несумненна, кожны грамадзянін павінен уносіць пасільны ўклад у развіццё нашай дзяржавы, а ў назначаны дзень рэферэндуму прыняць актыўны ўдзел ва ўсенародным галасаванні. Маладое пакаленне выразна ўсведамляе: паспяховае развіццё краіны магчыма толькі на моцным падмурку — Канстытуцыі, якая адпавядае патрабаванням сучаснага грамадства. Такое неабыякавае стаўленне, актыўная жыццёвая пазіцыя юнакоў і дзяўчат вельмі радуюць, бо насамрэч па абноўленым Асноўным законе ім давядзецца жыць.

**Таццяна БОНДАРАВА.**

*vitsebsk@nastgaz.by*

**Фота прадастаўлена медыяцэнтрам ВДУ імя П.М.Машэрава.**


"Настаўніцкая газета. - 2022. - 25 студз. - с. 3.